# ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ



Марыя Аркадзьеўна Бяспалая
Доктар гістарычных навук, прафесар
(1948–2021)

УДК 930.85(470)"185/193":[172.15+304]

*М. А. Бяспалая*

## Патрыятычныя маршы-песні «Развітанне славянкі» і «Свяшчэнная вайна» як сімвалічнае адлюстраванне сацыякультурнай дынамікі грамадства

*На аснове параўнаўчага аналізу гісторыі з'яўлення патрыятычных маршаў і іх культуралагічнага асэнсавання аўтар раскрывае сутнасць кардынальных перамен сацыякультурнага жыцця грамадства на працягу другой паловы XIX – пачатку XX ст. у Расійскай імперыі і ў 1920–1930-я гг. у СССР. Тлумачацца асноўныя прычыны і ўмовы гэтых неардынарных з'яў. Паказана, як праявіліся асаблівасці розных этапаў мадэрнізацыі грамадства ў маршах-песнях «Развітанне славянкі» і «Свяшчэнная вайна».*

Гістарыяграфія ў ракурсе абранай праблемы фактычна адсутнічае, хаця па даследуемых аб'ектах факталагічнай інфармацыі шмат. Аўтар карыстаўся звесткамі з Інтэрнэту, у тым ліку сайтамі «Камсамольскай праўды», «Рускай газеты» і інш.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адзначым, што кожная гістарычная эпоха папаўняла скарбонку нематэрыяльнай культурнай спадчыны бессмяротнымі шэдэўрамі. Успомнім «Іліяду» Гамера, якая данесла да нас звесткі аб Траянскай вайне, «Запіскі аб Гальскай вайне» Юлія Цэзара, «Песню аб Раландзе» – заходнееўрапейскі сярэдневяковы эпас, «Слова аб палку Ігаравым» – помнік літаратуры Кіеўскай Русі, шэдэўр старажытнарускай паэтыкі, «Песню пра зубра» Міколы Гусоўскага – выключны твор па сіле гуманістычнага гучання, жамчужына беларускай паэзіі, песню-марш «Марсельеза» – сімвал Французскай рэвалюцыі і гімн Францыі і г. д.

У грамадстве склаўся стэрэатып, што пра маршы-песні як знакавыя сімвалы міжваеннай эпохі вядома ўсё дасканала. Засяродзім увагу на такім факце, што марш «Прощание славянки» («Развітанне славянкі») напісаны больш за стагоддзе назад (1912) як патрыятычны водгук на падзеі чарговай вайны балканскіх славянскіх краін супраць туркаў (мал. 1). У музыцы, створанай В. І. Агапкіным, адлюстравана шчымлівае пачуццё развітання, магчыма, назаўсёды, славянскіх жанчын з блізкімі.

Музыказнаўцы вылучаюць самыя розныя версіі супадзення меладычнасці, танальнасці, выклікаючых душэўныя перажыванні за тых, хто ішоў абараняць родную зямлю, магчыма, не спадзяючыся на вяртанне, з творамі Л. ван Бетховена, П. Чайкоўскага і інш. Нам падаецца, што марш «Развітанне славянкі» па смутку і трагічнасці і адначасова патрыятычным настроі блізкі да ідэі паланэза «Развітанне з Радзімай» М. К. Агінскага.

Калі пачалася Першая сусветная вайна мелодыя марша стала надзвычай папулярнай не толькі ў расійскай арміі, але і па ўсёй краіне. У 1915 г. была выпушчана грамплацінка з яе запісам. На той час не было адзінага тэксту да марша. Напрыклад, у выкананні студэнтаў, прызваных у армію, «Развітанне славянкі» гучала так:

Приюты наук опустели,
Все студенты готовы в поход.
Так за Отчизну к великой цели
Пусть каждый из нас с верою идет…

Гэта радкі з песні «Вскормили вы нас и вспоили» [3].

Другая песня «Священная война» («Свяшчэнная вайна») стала своеасаблівым патрыятычным гімнам савецкага народа. Аднак яе папулярнасць узнікла не адразу. Верш В. І. Лебедзева-Кумача, на які была напісана песня, упершыню апублікаваны 24 чэрвеня 1941 г. у першым ваенным нумары газеты «Красная звезда» (мал. 2). Мастацкі кіраўнік Чырванасцяжнага ансамбля песні і пляскі Чырвонай арміі А. В. Аляксандраў, сябра і пастаянны музычны суаўтар паэта, напісаў да верша музыку. 26 чэрвеня на Беларускім вакзале, у Маскве, перад вайскоўцамі, якія адпраўляліся на фронт, упершыню прагучала песня

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(мал. 3). Заўважым, нотных запісаў пакуль не было, таму А. Аляксандраў напісаў ноты мелам на дошцы, а музыканты і выканаўцы перапісалі іх у свае сшыткі. Па ўспамінах прысутных, на вакзале знаходзіліся тысячы салдат, было вельмі шумна, але ўжо пасля першых гукаў «Свяшчэннай вайны» ўсталявалася абсалютная цішыня. Па патрабаванні салдат песню выконвалі пяць разоў бесперапынна, на суровых тварах былі слёзы.

На першых этапах ваеннага часу песня была забаронена па прычыне, якую прыдумалі ідэолагі – нібыта яна заклікала да цяжкага і доўгага змагання з ворагам, а не да хуткай перамогі. І толькі калі нямецкія войскі вермахта рынуліся на Маскву, захапіўшы Калугу, Калінін і іншыя гарады, 15 кастрычніка «Свяшчэнная вайна» прагучала па радыё. Пасля гэтага ў ваенныя гады кожнай раніцай песню-гімн перадавалі па радыё пасля бою крамлёўскіх курантаў, з ёю ішлі ў бой салдаты, абараняючы сваю радзіму. У ёй спалучаліся вялікія словы і геніяльная музыка, якія былі «магутнай зброяй» у барацьбе з ворагам, фарміравалі патрыятычны ўздым народа. У гэтай сувязі можна падтрымаць ідэю многіх даследчыкаў, што разам з патрыятычнай песняй нарадзілася вялікая краіна [2].

Пасля кароткіх экскурсаў аб гісторыі з'яўлення і папулярызацыі абодвух твораў лагічна вырашыць пытанне: ці магчыма было стварыць песню, падобную да «Свяшчэнай вайны», у Першую сусветную? Каб адказаць на гэтае пытанне, звернем увагу на асаблівасці сацыядынамікі расійскага грамадства ў адзначаны вышэй перыяд і савецкага грамадства ў міжваенны перыяд, ці інтэрбелум (прамежак часу паміж Першай і Другой сусветнымі войнамі).

Расійская імперыя ўступіла ў Першую сусветную вайну на этапе дастаткова прыметнай і хуткай мадэрнізацыі, якая была выклікана рэформамі 1860–1870-х гг. і садзейнічала пераменам у дзяржаўнай структуры, галінах эканомікі, урбаністычных працэсах, адукацыі, ваеннай справе і сельскай гаспадарцы. Паводле высноў некаторых навукоўцаў, Расія перад Першай сусветнай вайной па тэмпах развіцця дзяліла першае месца са ЗША.

Новыя павевы ў эканоміцы садзейнічалі пераменам у сацыяльнай структуры грамадства. Перанаселенасць вёскі стварала ўмовы для перасялення сялянскай моладзі ў прамысловыя цэнтры, набыцця рабочых прафесій. Важнейшае значэнне ў сацыядынаміцы грамадства мелі школьная і ваенная рэформы. Апошняя адмяніла рэкрутчыну і ўвяла абавязковае навучанне салдат першапачатковай грамаце. У выніку ў грамадстве з'явіліся адукаваныя людзі розных прафесій: інжынеры, аграномы, землямеры і інш. Нягледзячы на адкрыццё народных вучылішчаў, у канцы XIX – пачатку XX ст. адзначалася нізкая граматнасць вясковага насельніцтва ў сувязі з цяжкім эканамічным становішчам сялянства.

Аднак пад гукі гімна «Божа, ахоўвай цара!» і ідэалагічнага абгрунтавання зместу грамадскага жыцця – «самадзяржаўе, народнасць,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праваслаўе» – у краіне не фарміравалася адзінства ўсіх пластоў грамадства. Па-ранейшаму апорай трона заставалася тытулаванае і саноўнае дваранства, на падтрымку якога ўрад траціў больш сродкаў, чым на абарону краіны.

Правячыя колы не звярталі ўвагі на актывізацыю нацыянальнага руху на ўскраінах імперыі, большую занепакоенасць выклікаў рабочы рух, асабліва ў прамысловых цэнтрах. Не суцяшала і пазіцыя сялянства, якое пастаянна хвалявалася, і, як паказалі падзеі рэвалюцыі 1905–1907 гг., не праяўляла належнай павагі да прыватнай уласнасці памешчыкаў і нават да іх жыцця.

У пачатку XX ст. пад уплывам рэвалюцыйных падзей была зроблена спроба выправіць сітуацыю шляхам склікання Дзяржаўнай думы. Аднак яе чатыры скліканні не прынеслі прыкметных вынікаў, акрамя стварэння палітычных партый кадэтаў і акцябрыстаў. Фактычна фарміраванне расійскага парламентарызму знаходзілася ў самым пачатку.

Сацыяльныя і палітычныя абставіны аказвалі непасрэдны ўплыў на сацыякультурны стан грамадства. Нават прыдворныя колы дэманстравалі інтарэс да народных традыцый. Напрыклад, удзельнікі касцюміраванага балю-маскараду ў Зімнім палацы (1903) былі апрануты ў касцюмы, стылізаваныя пад народныя (сарафаны і какошнікі, кафтаны і інш.). Адзначым, што ў гэты перыяд і на старонках друку, асабліва нацыянальнага, у якасці галоўных асоб грамадства выступалі сяляне, рабочыя, разначынная інтэлігенцыя. Калі меркаваць па публікацыях, змешчаных у «Нашай ніве», гэты сацыяльны пласт насельніцтва стаў галоўным героем літаратурных твораў Ф. Дастаеўскага, М. Горкага, М. Ляскова, маладых беларускіх паэтаў Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча і інш.

Аднак адзначаныя пераўтварэнні глыбока не закранулі грамадства. Нават наданне сялянству грамадзянскіх правоў не магло хутка змяніць сітуацыю і паўплываць на яго сацыякультурную дынаміку. У Першую сусветную вайну ўступіла малаграматная сялянская маса, якая не разумела мэты вайны, не мела ваеннай падрыхтоўкі. Генерал А. А. Брусілаў успамінаў, што салдаты больш-менш ведалі, што нейкі там эрц-герцаг з жонкаю былі кімсьці забіты, і таму аўстрыякі хацелі пакрыўдзіць сербаў. Аднак хто ж такія сербы, не ведаў амаль ніхто, цьмяныя ўяўленні былі і аб тым, хто такія славяне, і зусім незразумелай была палітыка, чаму немцы з-за Сербіі ўздумалі ваяваць [1].

Мільёны ўчарашніх сялян, наспех абучаных і апранутых у ваенную форму, ішлі ваяваць за веру, цара і Айчыну. У першы год вайны баі ішлі на тэрыторыі Галіцыі і Прусіі, а ў 1915 г. яны вяліся непасрэдна на заходніх межах імперыі. Настрою армейцаў вельмі адпавядаў марш «Развітанне славянкі» з яго меладычнай тугою і ненадакучлівым пафасам. Адсутнасць афіцыйных слоў марша давала свабоду творчасці для ўсіх пластоў расійскага грамадства і арміі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, Першая сусветная вайна стала пераломным момантам сацыядынамікі расійскага грамадства. Неабходнасць у яго мадэрнізацыі не знікла пасля дзвюх рэвалюцый, заканчэння Першай сусветнай і Грамадзянскай войнаў. Вырашаць праблему давялося новым сацыяльным сілам у іншых ідэалагічных і сацыякультурных умовах.

Рэзкія перамены ў сацыяльным складзе грамадства праявіліся пасля рэвалюцыйных падзей 1917 г. На першы план у змаганні за сацыяльна справядлівую дзяржаву выйшлі маламаёмасныя пласты насельніцтва – рабочыя, учарашнія сяляне і шматмільённая салдацкая маса. Прадстаўнікі арыстакратыі, буржуазіі, памешчыкаў часткова эмігрыравалі, многія загінулі, у цэлым гэтая сацыяльная сіла фактычна перастала існаваць. Сацыякультурнае жыццё развівалася пад новымі заклікамі: «Хто быў нічым – той будзе ўсім!», «Фабрыкі – рабочым, зямля – сялянам, улада – Саветам!». На змену літаратуры, музыцы, выяўленчаму мастацтву сярэбранага веку прыйшла рэвалюцыйная творчасць. У ёй не знайшлося месца такім творам, як «Развітанне славянкі», тым больш, што марш стаў своеасаблівым сімвалам белага руху. Над усімі сацыякультурнымі пераменамі лунала ідэя класавай барацьбы і яе вядучай сілы – пралетарыяту.

Можна адзначыць, што на працягу 1917–1920 гг. адбывалася актыўнае фарміраванне новага грамадства і яго галоўнай сілай стала даваеннае пакаленне. Прадоўжыла гэтую лінію сацыядынамікі ў міжваенны перыяд пакаленне тых, каго выхавала і вылучыла на першы план рэвалюцыя і Грамадзянская вайна. Яго настрой дастаткова выразна адлюстраваны сябрамі літаратурнага аб’яднання «Маладняк», якія лічылі, што «растуць» у час пераходу да камунізму, які характарызуецца своеасаблівай культурай камуністычнага грамадства, з’яўляюцца маладняком новых усходаў і разрастаюцца, каб здзяйсняць у беларускім мастацтве ідэі камунізму, марксізму, ленінізму.

Рухавіком усіх пераўтварэнняў: індустрыялізацыі, калектывізацыі, урбанізацыі, культурнай і сацыяльнай рэвалюцыі, якія аб’ядноўваюцца паняццем «савецкая мадэрнізацыя», з’яўлялася Камуністычная партыя. Менавіта рашэнні партыйных з’ездаў і пленумаў выконвалі функцыі галоўнай праграмы далейшага развіцця. Нагадаем, рашэнні XIV з’езда ВКП(б) у 1925 г. вызначылі мэты, задачы, напрамкі прадаўжэння даваеннай індустрыялізацыі, XV з’езд (1927) прыняў курс на правядзенне ў жыццё палітыкі калектывізацыі, першачарговай задачай якой было аб’яднанне дробных сялянскіх гаспадарак у буйныя сацыялістычныя калектывы.

Кірункі і тэхналогія выканання гэтых задач таксама былі вызначаны партыйнымі органамі. Пакідаючы за рамкамі артыкула эканамічныя разлікі і планы, звернем увагу, што ўлады аптымальна выкарысталі змены ў сацыякультурнай дынаміцы грамадства, а менавіта працоўны энтузіязм моладзі. Адсюль заклік «Пяцігодку ў чатыры гады!»,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ініцыятыўная татальная прапаганда і падтрымка стаханаўскага руху ў розных галінах эканомікі, прапаганда гэтых працэсаў праз радыё, друк, патрыятычныя песні, вершы і г. д.

Адначасова з выкананнем заданняў пяцігодак дзяржавай быў арганізаваны выразны сацыякультурны працэс антыдынамікі. Масавы і бескампрамісны тэрор супраць заможнага сялянства прывялі да яго ліквідацыі, прыкметна была аслаблена навуковая і творчая інтэлігенцыя, масавыя рэпрэсіі закранулі нават ваенную сістэму.

Такім чынам, антысацыядынаміка аказалася складаючай часткай агульнага працэсу, вынікамі якога сталі з'яўленне новых класаў – фабрычна-заводскіх рабочых, калгаснага сялянства, рабоча-сялянскай інтэлігенцыі, рост адукацыйнага ўзроўню насельніцтва, актывізацыя яго тэрытарыяльнай мабільнасці.

У канцы 1930-х гг. быў створаны новы эканамічны, палітычны і сацыякультурны парадак, у гуманітарную місію якога верыла большасць насельніцтва. Менавіта ў гэтай новай сацыялістычнай супольнасці (у 1970-я гг. яна атрымала афіцыйную назву «савецкі народ») магла ўзнікнуць узнёслая патрыятычная і гераічная песня «Свяшчэнная вайна». Яе тэкст і музыка адпавядалі сацыякультурнаму настрою савецкага грамадства. Ужо першыя словы «Вставай, страна огромная, вставай на смертный бой» вызначалі і адзінства народаў, насяляючых вялікую краіну, указвалі на цяжкія ваенныя выпрабаванні і канкрэтна называлі ворага – фашысцкую цёмную сілу…

Фактычна песня «Свяшчэнная вайна» стала «малітвай» для армейцаў, партызан, працаўнікоў тылу і каталізатарам фарміравання адзінства савецкага народа. У цяперашні час гэты марш гучыць на ваенных парадах, абуджаючы настальгічныя пачуцці. На постсавецкай прасторы, як і за мяжой, «Свяшчэнная вайна» застаецца шырокавядомай.

Іншы лёс, але таксама аптымістычны, чакаў і марш-песню «Развітанне славянкі». У савецкі час яна фактычна была забаронена, а некаторымі тагачаснымі музыказнаўцамі разглядалася як прымітыўны тыповы дарэвалюцыйны марш.

Многія лічаць, што адраджэнне «Развітання славянкі» пачалося ў 1957 г., калі марш прагучаў у адным з эпізодаў фільма «Ляцяць жураўлі». Пасля гэтага песня «Развітанне славянкі» стала часткаю культурнага жыцця краіны. Да марша пачалі пісаць вершаваныя тэксты, сярод аўтараў А. Галіч. Першы афіцыйны тэкст створаны ў 1967 г., яго выконваў Ансамбль песні і пляскі Савецкай арміі імя А. Аляксандрава. У 1981 г. вядомым паэтам, мастацтвазнаўцам У. Лазаравым быў напісаны, на наш погляд, самы ўдалы тэкст. Ён адпавядае музыцы як настроем, так і пяшчотай і любоўю да Радзімы. У 1997 г. А. Мінгалёў стварыў тэкст, які стаў афіцыйным і выконваецца вядучымі калектывамі і артыстамі Расіі. З варыянтамі тэкстаў, напісаных да марша-песні «Развітанне славянкі», можна азнаёміцца на сайце Аляксееўскага стаўрапігіяльнага жаночага манастыра [3].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нягледзячы на тое, што ў 1991 г. фракцыі Р. Яўлінскага «Яблык» не ўдалося адстаяць імкненне ператварыць марш у гімн Расіі, у постсавецкі час «Развітанне славянкі» стала неафіцыйнай візітнай карткай краіны. Дачка В. Агапкіна ініцыявала ўключэнне «Развітання славянкі» ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Расійскай Федэрацыі. Ён гучыць на парадах, канцэртах, у гастрольных выступленнях, падчас ваенных візітаў, выконваецца замежнымі калектывамі. На сённяшні дзень марш-песня «Развітанне славянкі» шырокавядомы ва ўсім свеце.

Дарэчы, першы замежны тэкст да «Развітання славянкі» з'явіўся ў Польшчы ў 1937 г. У гады Другой сусветнай вайны пад назвай «Rozszumiały się wierzby płacrąze» ён стаў гімнам Арміі Краёвай – аднаго з кірункаў польскага супраціўлення.

Пераўтварэнні, якія з ім адбыліся, – гэта выразная ілюстрацыя ўзаемасувязі і ўзаемазалежнасці культурнага жыцця і сацыядынамікі грамадства, новага ўзроўню самасвядомасці насельніцтва. Прыйшоў час нацыянальнага адраджэння і спатрэбіўся адпаведны сімвал, ім і стаў марш-песня «Развітанне славянкі». У час Вялікай Айчыннай вайны ва ўмовах цяжкіх выпрабаванняў, з якімі сутыкнулася новая сацыяльная супольнасць – савецкі народ, з'явілася адпаведная песня «Свяшчэнная вайна» з патрыятычнай музыкай, узнёслымі словамі, заклікам і верай у перамогу.

Варта адзначыць, што маршы «Развітанне славянкі» і «Свяшчэнная вайна» сталі сімваламі эпохі, яны набліжалі дзень перамогі над ворагам, натхнялі на высокі подзвіг у імя будучыні.

*1. Брусилов, А. А.* Мои воспоминания / А. А. Брусилов ; предисл. П. А. Жилина. – М. : Воениздат, 1983. – 256 с.

*2.* История создания песни «Священная война» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://tunnel.ru/post-istoriya-sozdaniya-pesni-svyashhennaya-vojjna. – Дата доступа: 28.11.2020.

*3.* Марш «Прощание славянки» [Электронный ресурс] // Алексеевский ставропигиальный женский монастырь. – Режим доступа: http://www.hram-ks.ru/slavynka.shtml. – Дата доступа: 29.11.2020.

*M. Byaspalaya*

**Patriotic marches-songs "Farewell of Slavianka" and "The Sacred War" as a symbolic reflection of the sociocultural dynamics of a society**

*Based on a comparative analysis of the emergence of patriotic marches' history and their cultural interpretation, the author reveals the essence of radical changes in the sociocultural life of a society during the second half of the XIXth – early XXth century in the Russian Empire and in the 1920s – 1930s in the USSR. The main reasons and conditions of these extraordinary phenomena are explained. It is shown how the peculiarities of different stages of society modernization were manifested in the marches-songs "Farewell of Slavianka" and "The Sacred War".*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 30.11.2020.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ